чэрвень 2019

**Тэкст дыктанта**
**для правядзення ўступных іспытаў у X клас**
**ДУА «Мінскае абласное кадэцкае вучылішча»**

## Кругасветнае падарожжа

Кожны чалавек за свае жыццё дорыць вечнасці хоць адно кругасветнае падарожжа.

Толькі робіць гэта кожны па-свойму. Адзін ідзе па зямлі як гаспадар. Пад ім спружыняць, прагінаюцца дарогі. Яго кругасветнае падарожжа — штодзённая праца. Чалавек робіць яго то з плугам, то з касою, а то на возе, звозячы з лугу першы ўкос духмянага краскавага лета.

У другога ледзь-ледзь хапае жыцця і на адно кругасветнае падарожжа. Ён вытоптвае ў траве сцежкі, якія злучаюць яго хату са студняю або хлевам. Але чалавек непрыкметна натэпвае сваё кругасветнае падарожжа.

У трэцяга кругасветных падарожжаў хоць адбаўляй. Але робіць ён іх у мяккіх вагонах хуткіх цягнікоў.

Мае кругасветныя падарожжы не былі такія, якімі прынята іх лічыць. Я круціў свае сорак тысяч кіламетраў па шчодрай зямлі маіх прадзедаў. Мне не трэба было перад падарожжам садзіцца за вывучэнне чужой мовы: з лясамі, вёскамі, гарадамі мы гаварылі на нашай мове.

*(141 слова).*

*Паводле Я. Сіпакова*